Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

12 КРАСАВІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 70 (28686)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Транспланталогія як крытэрый чалавекалюбства**

**СТАР. 4**

**Сямейная газета**



**Валянціна Навіцкая пра дзяцей**



**Правы таты**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр КУЛІК, першы намеснік Міністра лясной гаспадаркі:**

*«29 тысяч гектараў новых лясоў плануецца пасадзіць у краіне ў 2018 годзе. Гэтыя работы пачаліся. Ужо пасаджана больш за 1 тысячу гектараў новых лясоў — у Брэсцкай і Гомельскай абласцях. Традыцыйна ў перыяд вясновых пасадак праходзіць акцыя «Тыдзень лесу». Сёлета яна адбудзецца з 14 на 21 красавіка і будзе прысвечана Году малой радзімы. Усе жадаючыя змогуць прыняць у ёй удзел. Для гэтага неабходна звярнуцца ў бліжэйшы лясгас або лясніцтва. Спецыялісты не толькі вызначаць месца і від працы, але і забяспечаць неабходным інвентаром, пасадачным матэрыялам. Галоўная мэта мерапрыемства — прыцягненне шырокай увагі грамадскасці да праблем ляснога фонду, папулярызацыя беражлівых адносін да аднаго з галоўных прыродных рэсурсаў краіны. Акцыя праводзіцца ў 11-ы раз».*

ISSN 1990 - 763X

# ДВА ВОЛАТЫ



Фота БЕЛТА.

**Гаспадаркі Зэльвенскага раёна прыступілі да сяўбы яравых зерневых культур.**
***На здымку:*** **механізатар КСУП «Галынка» Аляксандр КУЛІК.**

■ Жыццё вялікага горада

## МАРЫ ПРА ЛІПЫ

### Як дрэвам выжыць у гарадскім асяроддзі?

**Усе мы не раз чулі выраз: лясы — лёгкія нашай планеты. У гэтым выпадку паркі, скверы і нават алеі — лёгкія горада. На жаль, у Мінска гэты «орган» не зусім здаровы. Аднак спецыялісты не пакідаюць надзеі вярнуць яму былую сілу. Чарговая спроба — высадка 170 ліп уздоўж праспекта Незалежнасці.**

### Другая група

Аднак жаданне палепшыць экалагічную сітуацыю ў горадзе — не адзіная прычына такога рашэння. З мінулага лютага галоўная магістраль сталіцы прэтэндуе на ўнясенне ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў катэгорыі «Пасляваенная сацыялістычная архітэктура краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы». Паколькі ў 1940-я гады тут высаджвалі ліпы, было прынята рашэнне вярнуць менавіта гэтую пароду дрэў.

Так, каля дзвюх сотняў ліп плануюць высадзіць у наступныя два-тры тыдні, каб паспець да роспуску пупышак. Як расказала **кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі УП «Мінскзелянбуд» Анжаліка ПУЗАНКОВА**, звычайна ў Мінску высаджваюць дрэвы другой групы, але гэтым разам спыніліся на тых, што бліжэй да трэцяй — больш буйных. У іх таўсцейшая кара, што, магчыма, дапаможа дрэвам не так пакутаваць ад уздзеяння солі. Пры гэтым трэцяя група прыжываецца не так добра, як другая.

**СТАР. 3**



**Аказваецца, высадка «дарослых» дрэў была асвоена яшчэ як мінімум шэсцьдзясят гадоў таму.**

КОРАТКА

**Да 100 маладых афіцэраў запасу прызавуць у 2018 годзе на службу ва Узброеныя Сілы Беларусі. Гэта прадугледжана Указам № 134 «Аб прызыве афіцэраў запасу на ваенную службу», які Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 11 красавіка.**

Прэм'ера музычнага спектакля «Плошча Якуба Коласа» стане адным з галоўных мерапрыемстваў 34-га фестывалю «Мінская вясна», які пройдзе з 12 красавіка па 19 мая. Гэты твор сучаснага кампазітара Ларысы Сімаковіч напісаны да 135-годдзя з дня нараджэння беларускага песняра.

**Аграрыі Магілёўскай вобласці пачалі сяўбу яравых збожжавых культур. Першымі ў поле выйшлі аграрыі ў Бабруйскім, Глускім, Быхаўскім, Краснапольскім і Слаўгарадскім раёнах. Селякі выйшлі ў поле Чашніцкага і Пастаўскага раёнаў на Віцебшчыне.**

Тры беларускія ВНУ ўвайшлі ў сусветны рэйтынг Round University Rankings: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (706-е месца), Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (731-е) і Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (772-е). Тройку лідараў склалі Гарвардскі ўніверсітэт, універсітэт Чыкага і Каліфарнійскі тэхналагічны інстытут.